Алег Трусаў,
Аляксандр Краўцэвіч

# АРХЕАЛАГІЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ БАРЫСАГЛЕБСКАЙ ЦАРКВЫ І МАНАСТЫРА Ў ГРОДНЕ

*ТРУСАЎ Алег Анатольевіч — намеснік старшыні Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук.*

*КРАЎЦЭВІЧ Аляксандр Канстанцінавіч — першы прарэктар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1958 г. у в. Лупачы Мастоўскага раёна. Скончыў гістарычны факультэт БДУ (1981 г.). Даследуе матэрыяльную культуру гарадоў, мястэчак і замкаў Беларускага Панямоння XVI—XVII стст. Аўтар кніг "Майстар — наш продак" (Мн., 1990 г.), "Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV—XVIII стст." (Мн., 1991 г.).*

Барысаглебская (Каложская) царква XII ст. — унікальны помнік мураванай архітэктуры, значэнне якога ў нашай культуры цяжка пераацаніць. Сёння ад храма захавалася паўночная сцяна (не на ўсю вышыню), частка заходняй і дзве апсіды. Але і такая ступень захаванасці пабудовы XII ст. з'яўляецца надзвычай рэдкай для Беларусі, і мы павінны быць удзячны лёсу за тое, што да нас дайшоў, хоць часткова, не просты, а унікальны помнік, шэдэўр беларускага дойлідства.

Царква размясцілася на высокім пагорку, які аддзяляецца ад Замкавай гары рэчкай Гараднічанкай і з'яўляецца берагам Нёмана. З даўніх часоў гэта мясцовасць атрымала назву Каложа. Адно са старадаўніх паданняў сведчыць, што тут князь Вітаўт пасяліў палонных жыхароў аднаго з прыгарадаў Пскова, які называўся Каложай. Таму Барысаглебская царква больш вядомая пад назвай Каложская царква.

Няўмольны час прынёс значныя страты гэтаму унікальнаму помніку архітэктуры. У 1853 г. бераг быў падмыты вадой, і ўся паўднёвая сцяна, а з ёй і частка заходняй сцяны Каложскай царквы абрынулася ў Нёман. У 1889 г. абвалілася і паўднёвая апсіда.

Верхняя частка будынка разам са скляпеннямі і купалам была разбурана яшчэ раней. У канцы XIX ст. знішчаныя часткі храма былі ўзноўлены з дрэва, царкву накрылі двухскатным дахам, на якім зрабілі маленькі купал. У такім выглядзе будынак дайшоў да нашых дзён. Ён меў шэсць круглых слупоў і тры апсіды, якія выступаюць за абрыс усходняй сцяны.

Тапаграфічнае становішча, якое храм займаў у сярэднявечным горадзе — размяшчэнне яго воддаль ад дзядзінца і асноўнага пасада, на ўскраіне горада, — дазваляе выказаць меркаванне, што ён адпачатку быў манастырскай царквой. На карысць такой версіі сведчаць матэрыялы раскопак беларускіх археолагаў Я. Звяругі і А. Трусава ў наваколлі царквы ў пачатку 70—х і 80—х гг. Як вядома, мужчынскі манастыр

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Калажская царква. Рэканструкцыя П. Пакрышкіна.*

існаваў тут на працягу ўсяго сярэднявечча і ўпамінаецца ў пісьмовых крыніцах з XV ст.

У выніку нашых даследаванняў высветлілася, што росквіт манастырскага жыцця каля Каложы прыпадае якраз на XV—першую палову XVI стст. Менавіта да гэтага часу можна аднесці знаходкі шматлікіх керамічных начынняў на месцах драўлянай забудовы манастыра. Асобныя драўляныя будынкі базыльянскага манастыра пазначаны на планах Гародні канца XVIII —пачатку XIX стст., якія цяпер захоўваюцца ў Маскве ў Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве.

Першыя даследаванні Барысаглебскай царквы, якія можна назваць навуковымі, адбыліся ў XVIII ст. Іх аўтарам быў архімандрыт названага манастыра (у той час уніяцкага) Ігнат Кульчынскі, які ў 1738 г. пісаў аб падабенстве гродзенскага храма да Сафійскага сабора ў Полацку. Цікава, што даследчык грунтаваўся ў першую чаргу на падабенстве будаўнічага матэрыялу — цэглы-плінфы[1].

У XIX ст. царкву абследаваў У. Грознаў, які выявіў знакі на плінфе, фрэскавы роспіс на сцяне і ў алтары, а таксама пакінуў малюнак царквы[2]. У XIX ст. храм малявалі М. Альшынскі, В. Герсан, М. Кулеша, І. Трутнеў[3].

У першым дзесяцігоддзі XX ст. храм вывучаў П. Пакрышкін. Ён прапанаваў праект рэстаўрацыі, апублікаваны пазней М. Вароніным і А. Трусавым[4]. На ўзроўні сённяшніх ведаў гэты праект ацэньваецца як састарэлы.

І. Хозераў, які абследаваў царкву ў 1946 г., упершыню адзначыў наяўнасць усярэдзіне яе чатырох круглых слупоў, што ў храмах XII ст. на Беларусі больш нідзе не сустракаецца[5].

У 1935 г. у сувязі з рамонтам Калажскай царквы невялікія раскопкі ў будынку і вакол яго выканаў Ю. Ядкоўскі. Ён высветліў, што падмуркі бажніцы зроблены ўсухую з камянёў сярэдніх памераў і маюць глыбіню

каля 1,5 м. Унутры царквы даследчык сабраў шмат паліваных плітак падлогі XII ст., а ў паўночна—ўсходняй апсідзе прасачыў кавалак першапачатковай падлогі "in situ" (нечапанай). Над ёй знаходзілася праслойка чорнай зямлі таўшчынёй 5—8 см, а вышэй былі знойдзены фрагменты тоўстых (да 5 см) рэльефных арнаментаваных непаліваных плітак памерам 19,5х19,5 см. Гэтыя пліткі папярэдне можна аднесці да XIII ст. Рэшткі першапачатковай падлогі XII ст., зробленай з фігурных плітак з зялёнай і жоўтай палівай, былі прасочаны ў галоўнай апсідзе. Вынікі сваіх даследаванняў Ю. Ядкоўскі надрукаваў у 1936 г. асобнай працай[6].

Барысаглебская царква пабудавана ў больш складанай тэхніцы, чым храм на Замкавай гары (Ніжняя царква). Цагляная муроўка зроблена з добра абпаленай плінфы ў раўнарадавай тэхніцы.

Вапнавая рошчына, акрамя цамянкі, мае дамешкі дробна насечанай саломы і кавалачкаў драўлянага вугалю. Дзякуючы гэтым дамешкам яна вельмі трывалая. Муроўка сцен зроблена ў лусковай тэхніцы: з цэглы рабіліся толькі шчокі сцяны. Яе сярэдзіна складаецца з забутоўкі — цаглянага друзу і дробных камянёў.

Асаблівую ролю адыгрывалі галаснікі. Дыяметр іх гарлавін у сярэднім роўны 7—8 см. Выкарыстоўваліся яны для рэзанансу, а таксама памяншалі вагу скляпенняў і змяншалі гарызантальны распор. Таму купал і слупы, што падпіралі скляпенні, былі больш тонкія, і ўнутраная прастора царквы мае выгляд вялікай залы. Параўнаўча невялікі храм (13,5х21,5 м) уяўляецца значна большым па плошчы.

У 1971—1973 гг. археалагічныя раскопкі ў непасрэднай блізкасці ад царквы ажыццявіў Я. Звяруга. У 1971 г. ім былі закладзены два раскопы. Першы (54 $м^2$) быў зроблены ўсярэдзіне агароджы храма, другі (72 $м^2$) — на адлегласці прыблізна ў 50—60 м на паўночны ўсход ад царквы. У першым раскопе быў выяўлены старажытны могільнік; размяшчэнне пахаванняў каля культавых пабудоў — звычайная, як мы ведаем, з'ява. Расчышчана каля 20 пахаванняў. Нябожчыкі ляжаць на спіне, у большасці выпадкаў зарыентаваныя галавой на захад, рукі пакладзены ўздоўж тулава або складзены на жываце. Знойдзены толькі каваныя цвікі, іншых рэчаў няма.

На мацерыку расчышчана некалькі авальных ці амаль круглых ям глыбінёй 0,4—1,6 м і дыяметрам 0,7—1,4 м. У іх знойдзены рэшткі печаў—каменак: абпаленыя камяні, фрагменты глінянага посуду, косці жывёл, вуглі, попел. Развалы абпаленых камянёў выяўлены і ў другім раскопе. У выніку гэтых раскопак Я. Звяруга прыйшоў да высновы, што Каложскае паселішча з'явілася не пазней XII ст.[7].

У наступныя два гады даследаванняў Я. Звяруга заклаў на поўнач ад царквы чатыры раскопы агульнай плошчай 540 $м^2$. Культурны слой аднародны, шэрага колеру, толькі каля мацерыка ў некалькіх месцах меліся праслойкі цёмна—шэрай ці шэра—карычневай зямлі, а таксама сырой або абпаленай гліны. Таўшчыня слоя 0,4—0,9 м. Знойдзены рэшткі заглыбленых у мацярык печаў—каменак ад жылых наземных зрубных пабудоў.

Акрамя таго, у раскопе 1972 г. адкрыты дзве жылыя пабудовы зямлянкавага тыпу. Паколькі дрэва ў культурным слоі не захавалася, то наземныя пабудовы дэталёва не вывучаны.

Больш інфармацыі сабрана аб дзвюх зямлянках. Першая мае даўжыню 5,5 м, шырыню 4,4 м і заглыблена ў мацярык на 1,3—1,9 м, уваход знаходзіўся ў паўднёва—ўсходнім куце. Другая зямлянка (даўжынёй 2,9 м і шырынёй 2,3 м) заглыблена ў мацярык на 0,65—0,95 м, у паўднёва—ўсходнім куце месцілася печ. Абедзве пабудовы датуюцца канцом XIII—XIV стст., загінулі яны ад пажару. Ва ўсходняй сцяне першай зямлянкі знаходзіўся тайнік. У ім выяўлены чатыры сашнікі, тры амаль цэлыя сярпы і раздушанае гліняное начынне[8]. Магчыма, пагібель гэтых пабудоў звязана з нападамі крыжакоў, найбольш частымі якраз у канцы XIII—пачатку XIV стст.

У 1981 г., а таксама ў 1983—1984 гг. археалагічнае даследаванне Барысаглебскай царквы і яе наваколля праводзіў А. Трусаў[9] (у 1981 г. сумесна з П. Рапапортам).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Каложская царква. Знакі на плінфах. XII ст.*



*Фрагмент плітკі падлогі XIII ст. Знойдзена падчас рэстаўрацыі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У самой царкве ўскрыты асновы паўночна—ўсходняга, паўночна— і паўднёва—заходніх слупоў, цалкам раскапана апсідная частка, а таксама закладзены шурфы на прылягаючай да царквы тэрыторыі. Высветлілася, у прыватнасці, прыкладная роўнасць дыяметраў заходніх і падкупальных слупоў (1,85 і 1,75 м адпаведна). Асновы слупоў мелі не круглы, а квадратны план, складаліся з трох радоў плінфы і, у сваю чаргу, залягалі на падмурку з камянёў. Падчас раскопак у царкве сабрана вялікая колькасць фрагментаў плітак падлогі, пакрытых светла—жоўтай, зялёнай і карычневай палівай.

У паўднёвай апсідзе захаваўся ўчастак падлогі XII ст., выкладзены з квадратных і трохвугольных маёлікавых плітак. Падлога царквы знаходзілася на ўзроўні квадратнай асновы слупоў, пліткі мацаваліся на вапнавай рошчыне. Важным адкрыццём падчас гэтых даследаванняў можна назваць выяўленне пад Каложскай царквой культурнага слоя таўшчынёй 20—30 см, у якім знойдзены сляды матэрыяльнай культуры канца XI—першай паловы XII стст. Такім чынам, высветлілася, што паселішча на гэтым месцы існавала яшчэ да пабудовы тут храма.

Шурфамі, закладзенымі ў наваколлі царквы, выяўлены аднародны светла—шэры культурны слой, часам трапляліся праслойкі цёмна—шэрай зямлі. Таўшчыня наслаенняў вагаецца ад 0,4 да 2,2 м. Знойдзены археалагічны матэрыял датуецца XI—XIX стст. У ніжніх слаях сустракаліся рэшткі гаршкоў канца XI—XIII стст. Сярод знаходак — непаліваная кераміка XV ст. (гаршкі, міскі, макатры), упрыгожаная хвалістым або лінейным арнаментам. Акрамя керамікі ў шурфах выяўлены кавалкі плінфы, апрацаваны шліфавальны камень з мура Каложскай царквы. Больш познія матэрыялы прадстаўлены фрагментамі зялёнапаліванай і непаліванай кафлі XVII—XIX стст., двума фрагментамі паліхромнай кафлі, дымлёнай керамікай, вырабамі са шкла (аконнае шкло, бутэлькі, у тым ліку гарлавіна кварты XVI ст.), фрагментамі хвалістай дахоўкі, меднай манетай 1746 г., фрагментам нажа з касцяным дзяржаннем, глінянай дымлёнай люлькай XVIII ст., сярэбраным крыжыкам XIX ст.

Падчас рэстаўрацыйных работ 1985—1986 гг. былі раскрыты фрагменты фрэскавага роспісу, шматлікія графіці на сценах, а таксама знойдзены кавалкі непаліваных плітак падлогі XIII ст.

*Такім чынам, падсумоўваючы вышэйсказанае, можна сцвярджаць, што археалагічныя даследаванні прынеслі шматпланавую інфармацыю, якая паспрыяла вырашэнню многіх праблем.*

*Выяўлены існаванне паселішча XI ст., г. зн. яшчэ да ўзвядзення храма, наземныя зрубныя пабудовы канца XIII—XIV стст., наяўнасць побач з царквой хрысціянскага могільніка.*

*Атрыманыя звесткі паўплывалі на вызначэнне часу пабудовы царквы — канец XII ст.*

Гэтая інфармацыя дазволіла яшчэ цясней звязаць Каложу з іншымі помнікамі гродзенскай архітэктурнай школы XII ст., адкрытымі выключна археолагамі.

---

1 Орловский Е. К. Гродненская старина. Гродно, 1910.

2 Грязнов В. Коложская Борисоглебская церковь в г. Гродно. Вильна, 1893, с. 10.

3 Слючанка В. Р. Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне. Мн., 1992, сс. 36—37.

4 Воронин Н. Н. Древнее Гродно. М., 1954, рис. 53; Трусов О. А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI—XVII вв. Мн., 1988, с. 27, рис. 9.

5 Савецкі селянін, 1946, 24 кастрычніка.

6 Jodkowski J. Swiątynia warowna na Kałoży w Grodnie. Grodno, 1936, s. 37.

7 Зверуго Я. Г., Ткачев М. А. Археологические исследования в Гродно//Археологические открытия (далей — АО) 1971 г. М., 1972, сс. 407—408.

8 Зверуго Я. Г. Работы Верхненёманского отряда//АО 1972 г. М., 1973, сс. 360—361; Ён жа. Работы в Верхнем Понеманье//АО 1973 г. М., 1974, сс. 372—373.

9 Трусов О. А. Археологическое изучение архитектурных памятников Белоруссии//АО 1981 г. М., 1982, сс. 362—363; Ён жа. Изучение памятников архитектуры на территории Белоруссии//АО 1983 г. М., 1985, сс. 408—410; Друщиц С. А., Трусов О. А. Исследования архитектурно-археологической экспедиции//АО 1984 г. М., 1986, сс. 343—344.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ